Пралетары ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 262 (331) ЧАЦВЕР 14 ЛІСТАПАДА 1940 г.

Цана 10 капеек.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ВЫВУЧАЦЬ МАРКСІЗМ-ЛЕНІНІЗМ

14 лістапада 1938 года ЦК ВКП(б) прыняў пастанову аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Гэта пастанова мае выключна важнае значэнне для нашай партыі, для ўсіх савецкіх і гаспадарчых кадраў. Яна ўказала шляхі перабудовы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам сталінскага падручніка па гісторыі комуністычнай партыі.

Складзены камісіяй ЦК ВКП(б), пры асабістым удзеле таварыша Сталіна, «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» па-новаму ізлажыў і абагуліў гіганцкі вопыт барацьбы большэвіцкай партыі за звяржэнне капіталізма ў нашай краіне, за пабудову соцыялістычнага грамадства, даў вычарпальныя тлумачэнні па ўсіх асноўных пытаннях марксісцка-ленінскай тэорыі.

З выхадам «Кароткага курса» нельга было будаваць партыйную прапаганду старымі метадамі і формамі. ЦК ВКП(б) адзначыў, што «Асноўным недахопам пастаноўкі партыйнай прапаганды з'яўляецца адсутнасць неабходнай цэнтралізацыі кіраўніцтва партыйнай прапагандай і выцякаючыя адсюль саматужніцтва, неарганізаванасць у справе прапаганды».

Саматужніцтва і неарганізаванасць у пастаноўцы прапаганды выражаліся ў тым, што асноўнай формай прапаганды была вусная прапаганда праз гурткі. Партыйныя арганізацыі памылкова імкнуліся насаджаць гурткі, стараліся ў абавязковым парадку ахапіць імі ўсіх комуністаў. Гэта прыводзіла да таго, што партыйныя арганізацыі ўпусцілі галоўнае — якасць вучобы, кіраўніцтва прапагандай, звялі сваю дзейнасць галоўным чынам да збірання канцылярска-статыстычных звестак аб ахваце комуністаў вучобай у гуртках. Часта гэтымі гурткамі кіравалі тэарэтычна маладрыхтаваныя, палітычна непісьменныя і неправераныя людзі, якія не толькі не маглі дапамагчы членам партыі і беспартыйным таварышам авалодаць большэвізмам, але здольны былі падмяніць ізлажэнне марксісцка-ленінскай тэорыі шкодным упрашчэнствам, заблытаць сваіх слухачоў.

«Ператварыўшы наведванне гурткоў у абавязак для членаў партыі, разглядаючы партыйцаў, як вечных школьнікаў, няздольных да самастойнага вывучэння марксізма-ленінізма, — гаворыцца ў пастанове ЦК, — партарганізацыі прыбеглі да цэлага раду адміністрацыйных ухітрэнняў для ўцягнення і ўтрымання членаў партыі ў гуртках, сталі на шлях дробязнай апекі і рэгламентацыі работы комуністаў у гуртках». У рэзультаце гэтых і іншых няправільных установак, у комуністаў, абавязаных на працягу раду год займацца у тых-жа гуртках і пазбаўленых магчымасці вучыцца самастойна, трацілася зацікаўленасць да вучобы, наведванне гурткоў ператварылася ў цягасную абузу.

ЦК ВКП(б) указаў, як практычна перабудаваць партыйную прапаганду, прапанаваў абкомам, крайкомам і ЦК нацкомпартый скараціць колькасць гурткоў партыйнай асветы, указаў, што галоўным метадам вывучэння марксізма-ленінізма павінен стаць метад самастойнай вучобы.

З дня выдання пастановы ЦК ВКП(б) прайшло два годы. Партыйныя арганізацыі на месцах перабудавалі работу ў галіне партыйнай прапаганды ў адпаведнасці з указаннямі ЦК. І гэта перабудова дала свае станоўчыя вынікі. Кіруючыя партыйныя, савецкія, гаспадарчыя і іншыя кадры, партыйная і непартыйная інтэлігенцыя па-большэвіцку ўзяліся за вывучэнне марксізма-ленінізма. Можна напехі ў гэтай галіне ўжо дасягнуты нямалыя. Вялікая колькасць комуністаў і непартыйных работнікаў нашай Беластоцкай вобласці закончылі вывучаць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» і цяпер паспяхова вывучаюць асобныя творы класікаў марксізма-ленінізма. Можна назваць многа імён сакратароў райкомаў партыі, старшынь райвыканкомаў, сакратароў пярвічных партыйных арганізацый, настаўнікаў, урачоў, інжынераў, мастакоў, радавых комуністаў і непартыйных актывістаў, якія намнога павысілі свой узровень марксісцка-ленінскай асветы, правільна арыентыруюцца ў акружаючай абстаноўцы і паспяхова вырашаюць складаныя пытанні дзяржаўнага і гаспадарчага кіраўніцтва на месцах.

Аднак ёсць яшчэ нямала кіраўнікоў партыйных, савецкіх і гаспадарчых арганізацый, якія не працуюць над павышэннем сваіх марксісцка-ленінскіх ведаў. Некаторыя сакратары пярвічных партыйных арганізацый вельмі мала ўдзяляюць увагі арганізацыі партыйнай вучобы комуністаў. Створаныя гурткі ніжэйшага і сярэдняга звяна працуюць у асобных мясцах неарганізавана, як напрыклад, гурткі пры партарганізацыі ўпраўлення Беластоцкай чыгункі.

Пастанова ЦК ВКП(б) ад 14 лістапада 1938 года—гэта дакумент найвялікшай важнасці, які накіраван на паспяховае авалоданне нашымі кадрамі навукай усіх навук—марксізмам-ленінізмам.

Прыём у п. фон Рыбентропа ў чэсць таварыша В. М. Молатава

БЕРЛІН, 13 лістапада. (ТАСС). Увечары 12 лістапада міністр замежных спраў Германіі п. фон Рыбентроп зрабіў прыём у чэсць Старшыні Совета Народных Камісараў СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В. М. Молатава.

На прыёме прысутнічалі кіруючыя дзеячы германскіх урадавых органаў, нацыянал-соцыялісцкай партыі, прадстаўнікі вышэйшага камандавання Германскай Арміі, а таксама асобы, суправаджаючыя тав. В. М. Молатава, поўнамоцны прадстаўнік СССР у Берліне тав. Шкварцэў і адказныя работнікі поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР.

П. фон Рыбентроп і тав. В. М. Молатаў абмяняліся прамовамі.

Наведванне Старшынёй Соўнаркома і Народным Камісарам Замежных Спраў таварышам В. М. Молатавым Рэйхсмаршала Герынга і намесніка Гітлера п. Геса

БЕРЛІН, 13 лістапада. (ТАСС). Сёння ў 10 гадзін раніцы Старшыня Соўнаркома СССР і Народны Камісар Замежных Спраў таварыш В. М. Молатаў зрабіў візіт Рэйхсмаршалу Герынгу.

Услед за тым таварыш В. М. Молатаў наведаў п. Геса — намесніка Гітлера па кіраўніцтву нацыянал-соцыялісцкай партыі.

У апошнюю гадзіну.

Ваенныя аперацыі ў Міжземным моры

ЛОНДАН, 13 лістапада. (ТАСС). Марское міністэрства перадае наступнае паведамленне: «Англійскі ваенна-марскі флот нанёс сакрушальны ўдар італьянскаму флоту, асноўныя сілы якога знаходзіліся пад прыкрыццём берагавых батарэй на галоўнай базе італьянскага флота ў Таранта. Англійская марская авіяцыя таксама зрабіла ў ноч з 11 на 12 лістапада налёт на італьянскія караблі. Зробленым аэрофотаздымкам устаноўлена, што італьянскі лінкор класа Літорыо атрымаў настолькі моцныя пашкоджанні, што ўся насавая частка карабля знаходзіцца пад вадой, а сам карабль рэзка накраніўся на правы борт. Другі лінкор класа Кавур таксама атрымаў моцныя пашкоджанні. Кармавая частка карабля, у тым ліку адна з гарматных вежаў, знаходзіцца пад вадой. Яшчэ не ўдалося ўстанавіць, але не выключана, што другі лінкор гэтага-ж класа таксама атрымаў моцныя пашкоджанні.

ПРЫЗЫЎ У РАМЕСЛЕНЫ

Прызыў

Перад самым уваходам у памяшканне, дзе засядае камісія па прызыву ў чыгуначнае вучылішча,—надпіс: «Дабро пажалаваць». У карыдоры стаяць юнакі, якія неўзабаве павінны прайсці камісію. Некаторыя з іх хвалююцца. Гэта відаць па іх тварах. З пакоя прызыўной камісіі вышаў малады хлопец. Яго хутка акружаюць прызыўнікі.

— Як, прынялі цябе? — чуецца задорны голас.

— Зразумела! — усхвалявана адказвае прызыўнік, які вышаў з пакоя.

У пакоі, дзе засядае камісія па прызыву ў чыгуначнае вучылішча і школы фабрычна-заводскага абучэння, незвычайнае ажыўленне. Члены камісіі разглядаюць дакументы прызываемых, распытваюць іх. Старшыня гарадской камісіі па прызыву тав. Ражноўскі цікавіцца ўсімі дэталямі прызываемых. Прайшоўшы медыцынскі агляд, апошнія з'яўляюцца да стала, дзе сядзяць члены камісіі.

Вось да стала падыходзіць прызыўнік Аляксандр Клімко. Яго твар ззяе усмешкай. На ўсе пытанні ён адказвае ўпэўнена і быстра. Ён з горада Ліды. Там і цяпер жыве

У галоўным упраўлен

У адпаведнасці з пунктам 5-м Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР», начальнік Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў тав. Маскатаў выдаў загад аб форме вопраткі, выдаваемай за кошт дзяржавы навучаючымся Рамесленых і Чыгуначных Вучылішчаў. Форма вопраткі зацверджана Соўнаркомам Саюза ССР.

ШЫНЕЛЬ чорная, двухбартовая з грубашэрстнага сукна. На каўняры шынелі пятліцы з кантамі цёмнасіняга колеру—для навучаючыхся Рамесленых Вучылішчаў, і з кантамі малінавага колеру—для навучаючыхся Чыгуначных Вучылішчаў. На пятліцах шынеляў навучаючыхся Рамесленых Вучылішчаў прымацаваны металічныя літары Р. У і лічбы, указваючыя нумар вучылішча. На пятліцах шынеляў навучаючыхся Чыгуначных Вучылішчаў прымацаваны металічныя літары Ж. У. і лічбы, указваючыя нумар вучылішча. Гузікі на шынелі металічныя, з ізабражэннем перакрыжоўваючыхся малатка і гаечна-

Па Совецкай краіне

«ВЕГА» ВЯРНУЛАСЯ З ВУЧЭБНАГА ПЛАВАННЯ

РАСТОЎ-на-ДАНУ. Пасля пяцімесячнага марскога плавання ў Растоўскі порт вярнулася старэйшае вучэбнае паруснае судно «Вега». 145 выхаванцаў Растоўскага, Ленінградскага і Архангельскага марскіх тэхнікумаў прайшлі на ім першую суднавадзіцельскую практыку.


Будучыя штурманы далёкага плавання выдатна справіліся са складанымі ўмовамі ўпраўлення судном у штурмовае надвор'е і ўдалечыні ад берагоў.

«Вега» стала ў Растоўскім порце на зімоўку.

ПАДЗЕМНЫЯ ШТУРШКІ У РАЁНАХ ПАЛЕССЯ

10 лістапада прыблізна ў 4 гадзіны 40 мінут па маскоўскаму часу ў Мазыры на працягу некалькіх мінут адчуваліся падземныя штуршкі. У кватэрах зрыгалася мебля, затрымліваліся маятнікі насценных гадзіннікаў. Некаторыя дамы далі нязначныя трэшчыны. Падземныя штуршкі адчуваліся таксама і ў радзе раёнаў Палескай і Гомельскай абласцей.

У раёне Мазыра падземныя штуршкі не перавышалі 5 балаў, што не прадстаўляе ніякай небяспекі.



Уступіў у строй дзейнічаючых прадпрыемстваў гігант каляровай металургіі—сярэднеуральскі медзеплавільны завод.

На здымку: пробшчыца канвертарнага перадзелу комсамолка А. І. Ракіціна, перайшоўшая на вытворчасць з канторы заводаўпраўлення. Фота Ж. Берланд. Фота-клішэ ТАСС.

КАРАГАНДЗІНСКАЯ ЧЫГУНКА

КАРАГАНДА. Арганізавана новая чыгунка-Карагандзінская. Агульны працяг чыгункі—звыш 2,4 тысячы кілометраў.

Начальнікам упраўлення чыгункі назначан тав. Старкоў, начальнікам палітаддзела—тав. Гудкоў. Упраўленне новай чыгункі будзе знаходзіцца ў Акмолінску.

ЮБІЛЕЙ ІРКУЦКАЙ СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

Споўнілася 22 годы з дня стварэння Іркуцкай чырвонасцяжнай ордэнаноснай імені Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР стралковай дывізіі.

У годы грамадзянскай вайны дывізія прайшла легендарны шлях. Яна граміла Калчака, англа-французскіх інтэрвентаў, генерала Дутава, Врангеля і Махно. Тав. Фрунзе ў загадах па 4-й арміі Паўднёвага фронта і ў асабістых успамінах адзначаў выключны геразм і боездольнасць у баях пад Чангарам. За баявыя заслугі перад радзімай у годы грамадзянскай вайны дывізія двойчы ўзнагароджана ордэнам Чырвонага сцяга. За ўдзел у мірным будаўніцтве і за баявую падрыхтоўку дывізія ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэнам Леніна.

ПОМНІК НА МАГІЛЕ СІБІРСКІХ ПАРТЫЗАН

ІРКУЦК. На брацкай магіле партызан, паўшых у баях з Калчаком у 1919 годзе, адбыўся мітынг, прысвечаны адкрыццю помніка камандзірам сібірскіх партызан Каландарашвілі і Бурлову.

Помнік прадстаўляе сабой жалеза-бетонную скульптуру—трупу ўзброеных партызан, якія імкнуцца ўперад. У цэнтры групы—Каландарашвілі з велізарным сцягам. Вышыня помніка—4,5 метра.

...выбарчай акрузе № 11 тав. Пестрака Філіпа Сямёнавіча, 1903 года нараджэння, беларуса, з сялян-беднякоў, беспартыйнага. Тав. Пестрак 11 год прасядзеў у турме за палітычную дзейнасць, адкуль вызвален Чырвонай Арміяй, член саюза совецкіх пісьменнікаў, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

ЛІДЗІЯ ІВАНАЎНА ОСІПАВА

Акруговая выбарчая камісія гродненскай Занёманскай выбарчай акругі № 13 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных па Занёманскай выбарчай акрузе № 13 тав. Осіпаву Лідзію Іванаўну, 1900 года нараджэння, ураджэнку мястэчка Дзялічычы, Баранавіцкай вобласці, з сялян, беларуску, беспартыйную. З 1925 года працуе на табачнай фабрыцы ў г. Гродне.

МАРЫЯ АЛЯКСЕЕЎНА АСТРОЎСКАЯ

Акруговая выбарчая камісія гродненскай Занёманскай Паўднёва-Ўсходняй выбарчай акругі № 14 зарэгістрыравала для балатыроўкі у абласны Совет дэпутатаў працоўных па Занёманскай Паўднёва-Ўсходняй выбарчай акрузе № 14 тав. Астроўскую Марыю Аляксееўну, 1908 года нараджэння, беларуску, з сялян, ураджэнку вёскі Пяскі, Гродненскага раёна; работніца, беспартыйная, працуе на гродненскім фанерным заводзе зменным майстрам цэха.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

14-га лістапада, у 8 гадзін вечара, у Доме партыйнай асветы (вул. Талстога, 9) склікаецца семінар старшынь і сакратароў участковых выбарчых камісій горада Беластока.

ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ.

АСТОЦКАГА АБЛАСНОГА СОВЕТА ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Совецкай выбарчай акругі № 4 горада Беластока! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Стэфана Станіслававіча ЛЕНАРТОЎСКАГА!

★ ★ ★

Стэфан Станіслававіч Ленартоўскі

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

...Чэрвень 1905 года. Лодзінскія рабочыя—першыя ва ўсёй Расіі—са зброяй у руках паўсталі супроць царскіх войск. Рабочыя стралялі з дахаў, з акон. На вуліцы Наўрат рабочыя апракінулі возы з кіпамі бавоўны і пабудавалі з іх барыкады. Казацкія кулі вязнуць у мяккай бавоўне. Рабочыя адстрэльваюцца з-за барыкады.

Сярод іх — дзевятнаццацігадовы Стэфан Станіслававіч Ленартоўскі, ткач па шоўку—сын і ўнук ткача. 12-гадовым хлапчуком ён пайшоў працаваць на фабрыку і праз два годы быў ужо ткачом. Малым дзіцём ён разносіў рэвалюцыйныя лістоўкі. У бурным 1905 годзе малады ткач Ленартоўскі ўступае ў рады польскай соцыял-дэмакратыі.

І пацякло звычайнае жыццё рабочага-рэвалюцыянера: лістоўкі, сходы, забастоўкі, дэманстрацыі і... арышты. У 1906 годзе ён упершыню пазнаёміўся з казацкай нагайкай і турмой. У час думскіх выбараў у 1912 годзе рабочыя вылучаюць Ленартоўскага адным з выбаршчыкаў. Разам з іншымі ён едзе выбіраць дэпутата ў губернскі цэнтр, але паліцыя не дапускае яго да галасавання.

У 1913 годзе соцыял-дэмакраты і левыя пэпээсаўцы арганізуюць у Лодзі профсаюз тэкстыльшчыкаў, у праўленне якога вылучаецца і Ленартоўскі. Але жандарскі палкоўнік Леонцьеў разагнаў гэты профсаюз, а вясной 1914 года Ленартоўскі арыштоўваецца па гэтай справе.

Калі ў 1915 годзе рускія войскі адступілі з Лодзі, Ленартоўскі выйшаў на свабоду. Немцы высылаюць яго разам з тысячамі іншых рабочых на прымусовую работу ў Германію. Ленартоўскі трапляе ў Берлін, дзе працуе пры транспарце вугалю, а затым—на хімічным заводзе.

1918 год. У Германіі рэвалюцыя. Ленартоўскі выбіраецца рабочымі ў Берлінскі совет рабочых дэпутатаў. Ён прымыкае да спартакаўцаў, узначальваемых Розай Люксембург і Карлам Лібкнехтам. Пасля паражэння рэвалюцыі ён вымушан пакінуць Германію.

Ленартоўскі зноў у Лодзі. Рабочыя выбіраюць яго ў кіраўніцтва



профсаюза тэкстыльшчыкаў, якое складалася тады выключна з комуністаў. За ўпорную барацьбу супроць капіталістаў і супроць вайны з Совецкай Расіяй увесь састаў праўлення арыштоўваецца. Паўтара годы турмы, а затым—зноў работа на станку і рэвалюцыйная дзейнасць сярод рабочых. У 1922 годзе тав. Ленартоўскі выстаўляецца па комуністычнаму спіску на выбарах у лодзінскую гарадскую раду, але спісак аб'яўляецца несапраўдным, і Ленартоўскага на час выбараў арыштоўваюць. У наступныя годы яго арыштоўваюць пры кожнай забастоўцы, перад кожным 1 мая і гадавінамі Кастрычніка...

Ленартоўскі актыўна ўдзельнічае ва ўсіх буйных баях лодзінскіх тэкстыльшчыкаў: у забастоўках 1928, 1932 і ў слаўнай забастоўцы 1933 года, калі фабрыканты вымушаны былі згадзіцца на калектыўны дагавор. Арганізуецца тады левы профсаюз рабочых шоўкавых фабрык. Ленартоўскі—сакратар гэтага профсаюза, які з'явіўся перадавым атрадам лодзінскіх тэкстыльшчыкаў.

Набліжаецца польска-германская вайна. Буржуазія вядзе шавіністычную кампанію за пазбаўленне рабочых-немцаў работы на фабрыках. Паляк-рэвалюцыянер Ленартоўскі змагаецца супроць гэтай бруднай нацыяналістычнай хвалі, прымушае фабрыкантаў зноў прыняць зволеных на работу.

Вайна. Ленартоўскі, як і тысячы іншых рэвалюцыянераў, ідзе на ўсход, туды, дзе палымнее пяціканцовая звязда рэвалюцыі. Упершыню ён на свабоднай совецкай зямлі. Упершыню ён можа працаваць на карысць соцыялістычнага грамадства. У ліпені 1940 года Ленартоўскі паступае працаваць на беластоцкую плюшавую фабрыку.

— Я баяўся, ці змагу добра працаваць на ткацкіх станках іншай канструкцыі,—расказвае тав. Ленартоўскі,—але смела ўзяўся за работу, — і пайшло нядрэнна.

На самай справе, пайшло добра! Ленартоўскі пачаў перавыконваць нормы, стаў адным з лепшых рабочых ткацкага цэха — стаханаўцам плюшавай фабрыкі. У час перапынку ён чытае і растлумачвае рабочым газету. Ён — цэхавы агітатар і карыстаецца пашанай сярод усіх рабочых, якія выбіраюць яго старшынёй цэхавога камітэта. Калектыў плюшавай фабрыкі аказаў Стэфану Ленартоўскаму вялікае давер'е, вылучыўшы яго кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

М. Навагрудскі.

Сходы ўпаўнаважаных у Гродне

ГРОДНА. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** 10 лістапада ў Гродне прайшлі сходы ўпаўнаважаных па абмеркаванню кандыдатаў у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

З вялікім уздымам прайшоў сход упаўнаважаных 14-й выбарчай акругі, па якой вылучана для балатыроўкі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета Марыя Аляксандраўна Астроўская.

Тав. Астроўская — зменны майстар клеечнага цэха фанернага завода, дзе яна працуе з 1933 года. За ўдзел у забастоўцы яе зволілі. На працягу паўтара года яна была беспрацоўнай. Толькі з прыходам Чырвонай Арміі Марыя Астроўская зноў вяртаецца на завод. Працуючы клейшчыцай, яна паказвае ўзоры стаханаўскай работы. У жніўні гэтага года яе, як лепшую стаханаўку, вылучылі на пасаду зменнага майстра.

На сходзе ўпаўнаважаных 11-й выбарчай акругі, для балатыроўкі па якой вылучана кандыдатура Філіпа Сямёнавіча Пестрака, выступіў тав. Апякун. У сваім выступленні ён заявіў:

— З таварышом Пестраком я пазнаёміўся ў гродненскай турме, дзе ён сядзеў за тое, што змагаўся за свабоду працоўнага народа.

Сходы ўпаўнаважаных прайшлі па ўсіх выбарчых акругах.

Г. Лупсякоў.

ПАМЯТНЫЯ ДНІ

(Пяцігоддзе ўсесаюзнай нарады стаханаўцаў)

Пяць год таму назад, 14 — 17 лістапада 1935 года, у сталіцы вялікага Совецкага Саюза—Маскве—адбылася Першая ўсесаюзная нарада стаханаўцаў прамысловасці і транспарта. Гісторыя гэтай нарады паказвае, як высока цэняцца праца і людзі працы ў соцыялістычнай краіне.

Справа была так.

У ноч з 30 на 31 жніўня 1935 года ў Данбасе, на шахце «Цэнтральная-Ірміна», забойшчык Аляксей Грыгор'евіч Стаханаў устанавіў рэкорд здабычы вугалю. Ён вырубіў за адну змену 102 тоны вугалю. Стаханаў адзін здабыў столькі вугалю, колькі, па існаваўшых тады нормах, павінны былі здабыць 14 забойшчыкаў.

Вестка аб дасягненні Стаханава ўміг абляцела ўсю Совецкую краіну. У розных галінах народнай гаспадаркі паявіліся паслядоўнікі Стаханава. Кожны дзень прыносіў краіне радасныя весткі. У горадзе Горкім, на аўтамабільным заводзе, каваль Бусыгін устанавіў рэкорд па коўцы валаў. У Ленінградзе абуткоўшчык Сметанін перацягнуў за змену 1400 пар бацінак пры норме 680 пар.

Кожны рэкорд выклікаў новы ўздым соцыялістычнага спаборніцтва ў краіне. Пачаўся масавы рух за высокую прадукцыйнасць працы, рух, празваны стаханаўскім па імені яго зачынальніка—Стаханава.

Усё гэта адбывалася ў месяцы, напярэдадні святкавання XVIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. На свята ў Маскву былі запрошаны першыя стаханаўцы: Стаханаў, Бусыгін, Вінаградавы, Дзюканаў, Крыванос, Сметанін і дзесяткі іншых выдатных рабочых—герояў прамысловасці. Сярод гасцей сталіцы была вялікая група чыгуначнікаў-ударнікаў.

Велізарны зал Крэмля, дзе адбываюцца з'езды большэвіцкай партыі і сесіі совецкага парламента—Вярхоўнага Совета СССР,—быў перапоўнен да краёў. Зал занялі металісты і шахцёры, чыгуначнікі і ткачыхі, электрыкі і кандзіцеры, абутчыкі і будаўнікі танкаў, папернікі і сталявары, кавалі і швейнікі. Тут сабраліся лепшыя рабочыя Масквы і Ленінграда, Данбаса і Днепрапятроўска, Урала і Іванава. Горкага і Таганрога. Адны толькі што сышлі з паяздоў і прама з вакзала накіраваліся ў Крэмль; другія прыляцелі на самалётах.

Раздаўся званок, і ўсе погляды накіраваліся да стала прэзідыума. Праз некалькі мінут паявіліся таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Орджанікідзе, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Жданаў, Хрушчоў.

Доўгія мінуты тысячы людзей стоячы віталі любімага правадыра і яго саратнікаў. Кожны раз, калі, здавалася, авацыя сціхае, то ў адным, то ў другім канцы велізарнага зала раздавалася гучнае прывітанне правадыру; воклічы «ура», падхапляемыя воплескамі, сатрасалі купалы Крэмлёўскага палаца.

Чатыры дні працавала ў Крэмлі Першая Ўсесаюзная нарада стаханаўцаў. Гэта быў незвычайны з'езд. Тут не было дакладаў. І ў той-жа час кожнае выступленне было дакладам аб стаханаўскай творчасці ў той ці іншай галіне прамысловасці. Тут не было справаздач. І ў той-жа час у выступленнях кіраўнікоў партыі і ўрада таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава, Орджанікідзе, Кагановіча, Мікаяна, Жданава, Хрушчова, Шверніка ярка вырысоўвалася значэнне пачыну стаханаўцаў-піонераў для новых перамог соцыялізма.

Кіраўнікі партыі і ўрада ў сваіх прамовах высока ацанілі подвігі стаханаўцаў і паказалі, да якіх вялікіх перамог прыйдзе наша радзіма, калі стаханаўскі рух яшчэ больш разаўецца. Таварыш Молатаў назваў стаханаўцаў сталінскімі вучнямі.

17 лістапада, калі нарада падыходзіла ўжо к канцу, на трыбуну выйшаў таварыш Сталін. Правадыр народа, сустрэты бурнай авацыяй, пачаў сваю гістарычную прамову аб вялікай ролі стаханаўскага руху.

Таварыш Сталін раней усяго заявіў, што стаханаўскі рух быў-бы нямыслімы без новай тэхнікі. Большэвікі ператварылі Расію ў высокаіндустрыяльную краіну, багатую тэхнікай. Совецкія людзі, поўнасцю авалодаўшыя гэтай тэхнікай,—гэта стаханаўцы. Яны дабіваюцца такой высокай прадукцыйнасці працы, якую можа даць толькі соцыялізм і не можа даць капіталізм.

Таварыш Сталін указаў на прычыны хуткага распаўсюджання стаханаўскага руху па ўсёй краіне. Асновай стаханаўскага руху паслужыла перш за ўсё карэннае паляпшэнне матэрыяльнага становішча рабочых. «Жыць стала лепш, таварышы. Жыць стала весялей. А



А. Г. Стаханаў

Фота Ф. Кіслава. Фота-Клішэ ТАСС.

калі весела жывецца, работа спорыцца». Так сказаў таварыш Сталін. Так думалі ўсе стаханаўцы.

Другая крыніца стаханаўскага руху ў тым, што ў СССР няма эксплаатататараў, няма эксплаатацыі чалавека чалавекам. «Людзі працуюць у нас не на эксплаататараў, не для абагачэння дармаедаў, а на сябе, на свой клас, на сваё совецкае грамадства, дзе ва ўладзе стаяць лепшыя людзі рабочага класа. Таму-та праца мае ў нас грамадскае значэнне, яна з'яўляецца справай чэсці і славы.

Таварыш Сталін тут-жа растлумачыў найвялікшую розніцу паміж працай пры капіталізме і соцыялізме. У капіталістычным грамадстве праца мае прыватны, асабісты характар. «Ніхто цябе не ведае і ведаць не хоча. Ты працуеш на капіталістаў, ты іх абагачаеш? А як-жа інакш? Для таго цябе і нанялі, каб ты абагачаў эксплаататараў. Ты не згодзен з гэтым,—ступай у рады беспрацоўных і празябай, як ведаеш,—знойдзем іншых, больш згаворлівых. Таму-та праца людзей не высока цэніцца пры капіталізме. Зразумела, што ў такіх умовах стаханаўскаму руху не можа быць месца. Другая справа—ва ўмовах совецкага ладу. Тут працоўны чалавек у пашане. Тут ён працуе не на эксплаататараў, а на сябе, на свой клас, на грамадства. Тут працоўны чалавек не можа адчуваць сябе закінутым і адзінокім. Наадварот, працоўны чалавек адчувае сябе ў нас свабодным грамадзянінам сваёй краіны, свайго роду грамадскім дзеячом. І калі ён працуе добра і дае грамадству тое, што можа даць,—ён герой працы, ён авеян славай. Зразумела, што толькі ў такіх умовах мог зарадзіцца стаханаўскі рух».

Таварыш Сталін разглядзеў у стаханаўскім руху расткі комунізма.

У комуністычным грамадстве не будзе існаваць процілегласці паміж разумовай і фізічнай працай. Знішчэння гэтай процілегласці можна дасягнуць на аснове ўздыму культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа да ўзроўню работнікаў інжынерна-тэхнічнай працы. Высокая ступень авалодання тэхнікай, дасягнутая стаханаўцамі, паказвае, што стаханаўскі рух мае ў сябе першыя пачаткі такога культурна-тэхнічнага ўздыму рабочага класа.

Таварыш Сталін з геніяльнай празорлівасцю прадбачыў магутнае развіццё стаханаўскага руху. «Сёння стаханаўцаў яшчэ мала, але хто можа сумнявацца, што заўтра іх будзе ўдзесяцёра больш?»—гаварыў таварыш Сталін.

За прайшоўшыя пяць год стаханаўскі рух шырока разросся і ў горадзе і ў вёсцы—у прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, на транспарце. Першыя расткі стаханаўскага руху ўзняліся і на новых совецкіх землях: у заходніх абласцях Украіны і Беларусі, у Літве, Латвіі, Эстоніі, Бесарабіі, Паўночнай Букавіне,—як толькі там была звергнута ўлада памешчыкаў і капіталістаў і ўстаноўлена ўлада працоўных.

За 5 год стаханаўскі рух абагаціўся новымі формамі. Паявіліся стаханаўцы-многастаночнікі (людзі, якія пераходзяць на адначасовае абслугоўванне некалькіх станкоў). Паявіліся стаханаўцы—сумяшчальнікі прафесій (людзі, адначасова выконваючыя работу сумежнай прафесіі і дазваляючыя таму з меншым лікам работнікаў выпускаць больш прадукцыі).

Сіла стаханаўскага руху — у яго масавасці. Ва ўсіх раёнах СССР спаборнічаюць не толькі стаханаўцы прамысловасці, але і стаханаўцы калгасаў.

Так у совецкай краіне добрае пачынанне аднаго работніка хутка становіцца здабыткам тысяч і дзесяткаў тысяч людзей, здабыткам усяго грамадства. Гэта магчыма толькі ў СССР, толькі ў краіне соцыялізма, дзе людзі жывуць і працуюць у цесным садружастве, на дабро ўсяго народа.

Г. Сенін.

НЯСТОМНА АВАЛОДВАЦЬ НАВУКАЙ УСІХ НАВУК—ТЭОРЫЯЙ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА

★ ★ ★

Інтэлігенцыя вывучае „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)“

Сёння спаўняецца два годы з дня выдання пастановы ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». ЦК ВКП(б) даў канкрэтныя ўказанні, як перабудаваць партыйную прапаганду. У пастанове ЦК гаворыцца, што «Кароткі курс» у першую чаргу накіраван да нашых кадраў, партыйных і непартыйных, да нашай інтэлігенцыі.

Нашы кадры правільна зразумелі гэта ўказанне ЦК партыі. Партыйныя і непартыйныя бальшэвікі сур'ёзна пачалі вывучаць гісторыю партыі. У беластоцкай гарадской партыйнай арганізацыі самастойна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» 1646 чалавек. 78 чалавек займаецца ў гуртках. Сур'ёзна працуе над аўладаннем тэорыі бальшэвізма інтэлігенцыя горада, галоўным чынам, настаўнікі, інжынеры, урачы. Многія з іх ужо закончылі вывучаць усе 12 раздзелаў «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Выкладчык гісторыі 1-й школы тав. Хлопскі закончыў вывучаць гісторыю партыі па падручніку і зараз вывучае кнігу Сталіна «Пытанні ленінізма», Леніна «Развіццё капіталізма ў Расіі». Закончылі вывучаць падручнік выкладчык 20-й школы тав. Гуза, выкладчык 6-й школы тав. Гілер, выкладчык 17-й школы тав. Друшт і многія іншыя. Усе яны цяпер працуюць над асобнымі творамі Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Заканчваюць вывучаць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» настаўніца 4-й школы тав. Жэленская, тав. Яшчук-Гузінская і іншыя.

Для інтэлігенцыі горада арганізавана 15 гурткоў па вывучэнню гісторыі партыі. У гэтых гуртках займаецца 250 чалавек. Прачытана 23 лекцыі і даклады на розныя тэмы, праведзена 8 нарад па пытанню вывучэння гісторыі ВКП(б).

Трэба адзначыць, што інтэлігенцыя горада жыва цікавіцца пытаннямі гісторыі партыі, акуратна наведвае лекцыі, даклады, прыходзіць у партыйны кабінет, каб атрымаць кансультацыі па тых ці іншых пытаннях гісторыі партыі. У рэзультаце сур'ёзнай работы над павышэннем сваіх тэарэтычных ведаў многія настаўнікі, урачы ўключыліся ў актыўную грамадскую работу. 80 чалавек з'яўляюцца дакладчыкамі і лектарамі гарадскога камітэта партыі; яны чытаюць даклады і лекцыі на польскай, яўрэйскай і рускай мовах.

Загадчык кафедры замежных моў педагагічнага інстытута тав. Бургін прачытаў 8 лекцый на тэму: «Рэлігія і нацыянальная рознь». Яго лекцыі праслухала 620 чалавек. Зараз тав. Бургін падрыхтоўвае лекцыі на іншыя тэмы.

Інтэлігенцыя, нашы партыйныя і непартыйныя кадры зараз уключыліся ў агітацыйную работу на выбарчых участках. Створана 73 агіткалектывы, у якіх працуе 1.460 агітатараў. З агітатарамі праведзены 20-дзённыя курсы. На гэтых курсах займалася 200 чалавек.

Агітатары разгарнулі агітацыйную работу сярод выбаршчыкаў.

Я. Кіркаешта,
загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Беластоцкага гаркома партыі.

Партыйная вучоба ў Ломжы

У пастанове ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» сказана:

«Кароткі курс гісторыі ўсесаюзнай комуністычнай партыі (бальшэвікоў)» з'яўляецца важнейшым сродкам у справе вырашэння задачы авалодання бальшэвізмам, узбраення членаў партыі марксісцка-ленінскай тэорыяй, гэта значыць веданнем законаў грамадскага развіцця і палітычнай барацьбы, сродкам павышэння палітычнай пільнасці партыйных і непартыйных бальшэвікоў, сродкам узняцця справы прапаганды марксізма-ленінізма на належную тэарэтычную вышыню».

Гэта разумеюць партыйныя і непартыйныя бальшэвікі Ломжы, таму яны ўпорна працуюць над вывучэннем «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Самастойна вывучаюць тэорыю марксізма-ленінізма 369 чалавек, з якіх комуністаў —141, комсамольцаў — 81 і беспартыйных — 147 чалавек. Беспартыйныя гэта ў асноўным настаўнікі і медыцынскія работнікі.

З ліку пярвічных партыйных арганізацый горада асабліва выдзяляецца пастаноўкай партыйнай вучобы партарганізацыя міліцыі. Сакратар гэтай пярвічнай партарганізацыі тав. Радзіонаў грунтоўна працуе над павышэннем свайго ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню. З моманту выхаду ў свет «Кароткага курса» ён вывучыў яго на працягу 9 месяцаў, склаў канспекты. Цяпер тав. Радзіонаў паўторна працуе над «Кароткім курсам», але ўжо з вывучэннем першакрыніц. Ён прачытаў работы Леніна «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі», «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм», твор Энгельса «Анты-Дзюрынг», «Пытанні ленінізма» Сталіна. Ён шырока выкарыстоўвае артыкулы, якія друкуюцца ў дапамогу вывучаючым гісторыю ВКП(б) у газетах і журналах. Тав. Радзіонаў заяўляе:

— Асаблівую ўвагу я ўдзяляю вывучэнню 4-га раздзела «Кароткага курса», бо лічу, што калі не буду ведаць зместа гэтага раздзела, то нельга зразумець законаў развіцця прыроды і чалавечага грамадства.


У сваёй пярвічнай партарганізацыі тав. Радзіонаў наладзіў сістэматычны кантроль за ходам вывучэння комуністамі гісторыі партыі. Ён перыядычна праводзіць індывідуальныя гутаркі з комуністамі па вывучанаму матэрыялу, арганізоўвае таварыскія субяседванні, выносіць пытанні вучобы комуністаў на агульны партыйны сход. У выніку гэтага комуністы адчуваюць адказнасць і працуюць над сабой. Так, напрыклад, тав. Хадановіч — начальнік гарадскога аддзялення міліцыі — вывучае X раздзел «Кароткага курса». Апрача таго, ён вывучыў асобныя творы Леніна — «Крок уперад, два крокі назад», «Дзве тактыкі...» і іншыя.

Разам з гэтым многія комуністы гэтай партыйнай арганізацыі ўсё яшчэ вывучаюць толькі дакастрычніцкі перыяд гісторыі ВКП(б).

Добра арганізаваў кантроль і дапамогу комуністам у справе вывучэння гісторыі партыі сакратар пярвічнай партарганізацыі загатоўчых органаў тав. Губіч. Ён гутарыць з комуністамі аб вучобе, правярае іх канспекты, пытанні вучобы ставіць на партыйных сходах.

Ломжынская партыйная арганізацыя дабіваецца, каб у кожнай пярвічнай партарганізацыі вучоба комуністаў была сістэматычнай, штодзённай, каб дапамога і кантроль за палітычнай самаадукацыяй комуністаў былі пастаяннымі і канкрэтнымі.

Корбут.



„Кароткі курс гісторыі ВКП(б)“ аб аўладанні рэволюцыйнай тэорыяй

«Без рэволюцыйнай тэорыі, гаварыў Ленін, не можа быць і рэволюцыйнага руху... Ролю перадавога барацьбіта можа выканаць толькі партыя, кіруемая перадавой тэорыяй» (стар. 36).

«Марксісцкая партыя ёсць частка рабочага класа, яго атрад. Але атрадаў у рабочага класа многа,—стала быць, не ўсякі атрад рабочага класа можа быць назван партыяй рабочага класа. Партыя адрозніваецца ад іншых атрадаў рабочага класа перш за ўсё тым, што яна з'яўляецца не простым атрадам, а ПЕРАДАВЫМ атрадам, СВЯДОМЫМ атрадам, МАРКСІСЦКІМ атрадам рабочага класа, узброеным веданнем грамадскага жыцця, веданнем законаў развіцця грамадскага жыцця, веданнем законаў класавай барацьбы і здольным, з прычыны гэтага, весці рабочы клас, кіраваць яго барацьбой» (стар. 45).

«Гісторыя партыі вучыць, далей, што партыя рабочага класа не можа выканаць ролі кіраўніка свайго класа, не можа выканаць ролі арганізатара і кіраўніка пролетарскай рэволюцыі, калі яна не авалодала перадавой тэорыяй рабочага руху, калі яна не авалодала марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Сіла марксісцка-ленінскай тэорыі заключаецца ў тым, што яна дае партыі магчымасць арыентавацца ў абстаноўцы, зразумець унутраную сувязь акружаючых падзей, прадбачыць ход падзей і распазнаць не толькі тое, як і куды развіваюцца падзеі ў сучасным, але і тое, як і куды яны павінны развівацца ў будучым.

Толькі партыя, якая авалодала марксісцка-ленінскай тэорыяй, можа ісці ўперад упэўнена і весці рабочы клас уперад.

...Можа здацца, што аўладаць марксісцка-ленінскай тэорыяй—значыць добрасумленна завучыць асобныя вывады і палажэнні, якія ёсць у творах Маркса—Энгельса—Леніна, навучыцца своечасова цытыраваць іх і супакоіцца на гэтым, спадзяючыся, што завучаныя вывады і палажэнні будуць прыгодны для любой абстаноўкі, на ўсе выпадкі жыцця. Але такі падыход да марксісцка-ленінскай тэорыі з'яўляецца зусім няправільным. Марксісцка-ленінскую тэорыю нельга разглядаць, як збор догматаў, як катэхізіс, як сімвал веры, а саміх марксістаў,—як буквaедаў і начотчыкаў. Марксісцка-ленінская тэорыя ёсць навука аб развіцці грамадства, навука аб рабочым руху, навука аб пролетарскай рэволюцыі, навука аб будаўніцтве комуністычнага грамадства. Яна, як навука, не стаіць і не можа стаяць на адным месцы,—яна развіваецца і ўдасканальваецца. Зразумела, што ў сваім развіцці яна не можа не ўзбагачацца новым вопытам, новымі ведамі, а асобныя яе палажэнні і вывады не могуць не змяняцца з цягам часу, не могуць не замяняцца новымі вывадамі і палажэннямі, адпавядаючымі новым гістарычным умовам.

Аўладаць марксісцка-ленінскай тэорыяй зусім не значыць—завучыць усе яе формулы і вывады і чапляцца за кожную букву гэтых формул і вывадаў. Каб аўладаць марксісцка-ленінскай тэорыяй, трэба, перш за ўсё, навучыцца адрозніваць паміж яе буквай і сутнасцю.

Аўладаць марксісцка-ленінскай тэорыяй—значыць усвоіць СУТНАСЦЬ гэтай тэорыі і навучыцца карыстацца гэтай тэорыяй пры вырашэнні практычных пытанняў рэволюцыйнага руху ў розных умовах класавай барацьбы пролетарыята.

...Марксісцка-ленінская тэорыя ёсць не догма, а кіраўніцтва к дзеянню». (стар. 335—336).

Публічныя лекцыі

Беластоцкая партыйная арганізацыя ў апошнія месяцы перабудавала сістэму лекцыйнай партыйнай прапаганды. У асноўным цяпер праводзяцца платныя публічныя лекцыі. Лектарамі абкома за апошні час прачытана 37 платных лекцый. Гэтыя лекцыі праходзяць больш арганізавана, чым няплатныя. На іх збіраецца больш аднолькавая па свайму палітычнаму ўзроўню аўдыторыя. З вялікай зацікаўленасцю слухачы ўспрынялі лекцыю тав. Гракава на тэму: «ППС—нацыяналістычная контррэволюцыйная партыя Польшчы». У Ломжы на гэту лекцыю прышло столькі слухачоў, што ўсіх немагчыма было змясціць у зале. Лекцыю прышлося паўтарыць на другі дзень.

Пры платных лекцыях павышаецца адказнасць лектара: аўдыторыя больш патрабавальна да яго. Слухачы патрабуюць не толькі змястоўнай лекцыі, але і адказу на многія пытанні, якія ўзнікаюць у іх у час слухання лекцыі. Так, пасля маёй лекцыі аб дыялектычным метадзе, якую я чытаў у гор. Цэханавец, было зададзена такое пытанне: «Раскажыце аб рухаючых сілах совецкага грамадства». Гэта вялікае і сур'ёзнае пытанне. Цяпер на гэту тэму лектарская група абкома рыхтуе спецыяльную лекцыю.

Цікавасць да філасофскіх пытанняў, да вывучэння дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма вельмі вялікая. Усіх запатрабаванняў раёнаў на лекцыі па 2-му падраздзелу IV раздзела «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» мы яшчэ далёка не задавальняем. Тут неабходна многа працаваць, каб аказаць дапамогу самастойна вывучаючым гісторыю бальшэвіцкай партыі.

Асаблівая ўвага ў лекцыйнай рабоце ўдзяляецца паслякастрычніцкаму перыяду гісторыі нашай партыі. Платная лекцыя лектара абкома партыі тав. Захаравай «Партыя бальшэвікоў у перыяд грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі» прайшла з поспехам. Яе ў Свіслачы праслухала 240 чалавек, у Скідэлі—320 чалавек.

Добра прайшлі платныя лекцыі тав. Дзенісюк аб стварэнні комуністычнага інтэрнацыянала, якія былі прачытаны ў Аўгустове, Граеве, Ваўкавыску і Дамбраве.

Платныя лекцыі прачытаны аб рабоце Леніна «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізма» у Граеве, Бельску, Цэханаўцы лектарам абкома тав. Якімовічам.

Да чытання платных лекцый прыцягваюцца і няштатныя лектары абкома. Тав. Вольпе прачытаў лекцыі ў Аўгустове і Свіслачы аб жыцці і літаратурнай дзейнасці Адама Міцкевіча. Лекцыі прайшлі паспяхова.

Цяпер лекцыйная тэматыка значна пашыраецца. Лектары абкома распрацоўваюць новыя тэмы. Асаблівую ўвагу мы ўдзяляем распрацоўцы мясцовых матэрыялаў.

Задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб абагуліць набыты вопыт у правядзенні платных лекцый, узняць іх якасць.

Т. Гладзікаў,
кіраўнік лектарскай групы абкома партыі.

★ ★ ★

Вывучаю творы Маркса і Леніна

Пастанова ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» мабілізавала нашы кіруючыя кадры на сур'ёзную самастойную работу па вывучэнню марксісцка-ленінскай тэорыі і гісторыі бальшэвіцкай партыі.

Памятаючы, што без усебаковай тэарэтычнай загартоўкі нельга паспяхова справіцца з вялікай задачай выхавання падрастаючага пакалення і ўсіх працоўных у комуністычным духу, я, як работніца культурнага фронта, з пачатку выхаду ў свет «Кароткага курса» прыступіла да самастойнай работы над ім. Дэтальнае вывучэнне ўсіх 12 раздзелаў «Кароткага курса» я закончыла больш двух месяцаў таму назад і прыступіла да вывучэння асобных твораў класікаў марксізма-ленінізма. За гэты перыяд мною прачытаны і заканспектыраваны «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі» — Леніна, «Комуністычны маніфест» — Маркса і Энгельса. Зараз працую над кнігай таварыша Сталіна «Марксізм і нацыянальнае пытанне».

У рабоце над палітычнай самаадукацыяй я заўсёды карыстаюся журналамі «У дапамогу маркісцка-ленінскай самаадукацыі», «Спутнік агітатара». Рэгулярна чытаю газету «Правда». Адначасова чытаю і мастацкую літаратуру. У апошні час мною прачытаны: зборнік «1919 год», «Пролог» Чэрнышэўскага і іншыя мастацкія творы.

Самастойная работа над самаадукацыяй мне вельмі многа дапамагае ў кіраўніцтве школай, у выхаванні дзяцей у духу комунізма.

Мне неаднаразова прыходзілася наведваць лекцыі, якія чыталіся пры раённым партыйным кабінеце. Трэба адзначыць, што многія з гэтых лекцый былі недастаткова падрыхтаваны і мала далі карысці комуністам, совецкім і гаспадарчым кадрам у самастойнай рабоце.

У далейшым аддзелу прапаганды і агітацыі райкома партыі трэба звярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку поўнацэнных лекцый. Партыйны кабінет павінен таксама па-сапраўднаму дапамагаць у самастойнай вучобе нашых кадраў.

Ольга Карпей,
дырэктар 2-й ваўкавыскай сярэдняй школы.

Лётчыкі авалодваюць бальшэвізмам

Увесь асабовы састаў Н-скай часці, якой камандуе Герой Совецкага Саюза тав. Нога, многа і ўпорна працуе над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню. «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» стаў у іх настольнай кнігай.

У асноўным усе лётчыкі вывучаюць цяпер X раздзел. Як-жа яны вывучаюць гісторыю ВКП(б)? Раскажам аб гэтым на прыкладзе работы кандыдата партыі лейтэнанта тав. Кукушкіна.

Тав. Кукушкін пачаў вывучаць гісторыю партыі адразу пасля выхаду ў свет падручніка. Перш за ўсё ён прачытаў падручнік, каб пазнаёміцца з усім матэрыялам. Затым ён пачаў вывучэнне па раздзелах. Прачытаўшы раздзел, тав. Кукушкін пачынае канспектыраваць прачытанае. У канспекце ён запісвае галоўнае. Як толькі заканчвае вывучэнне раздзела па падручніку, прыступае да чыткі дадатковага матэрыялу з твораў Леніна і Сталіна.

Да першых раздзелаў падручніка тав. Кукушкін вывучыў наступныя творы Леніна: «Што рабіць?», «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць соцыял-дэмакратаў», «Развіццё капіталізма ў Расіі», «Дзве тактыкі...», «Крок уперад, два крокі назад», асобныя артыкулы аб сялянстве і т. д.

Тав. Кукушкін гаворыць, што асабліва многа прышлося яму папрацаваць над асваеннем IV раздзела падручніка «Аб дыялектычным і гістарычным матэрыялізме». На гэту тэму ён праслухаў некалькі лекцый, прачытаў асобныя артыкулы з друкуемага матэрыялу ў газеце «Правда». Некалькі разоў прачытаў і прадумаў матэрыял з падручніка. І толькі тады, калі канчаткова ўсвоіў усё прачытанае, прыступіў да вывучэння класічнага твора Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Вялікую дапамогу ў вывучэнні кароткага курса аказвае партыйная арганізацыя.

Вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» дапамагае яму ў практычнай рабоце. З'яўляючыся камандзірам звяна, ён па-бальшэвіцку выхоўвае сваіх людзей. Яго звяно лепшае ў часці, і ўвесь асабовы састаў звяна занесен на дошку пачота. Зараз тав. Кукушкін працуе агітатарам на ўчастку.

М. Кочкін.

Кіраўніцтва да паўсядзённай практычнай работы

З «Кароткім курсам гісторыі ВКП(б)» я пазнаёміўся яшчэ ва ўмовах капіталістычнай Польшчы.

Выключна багатае асвятленне мінулага, ясныя перспектывы будучага адкрыліся нам пры вывучэнні вопыта рэволюцыйнай барацьбы, абагуленага ў гэтай выдатнай кнізе, вопыта, які з усёй яснасцю раскрывае перад намі асноўныя законы грамадскага развіцця і рэволюцыйнага рабочага руху.

Гэта кніга ізложана выключна яснай мовай. З выключнай прастатой, прадзельнай яснасцю і разам з тым строга навукова ізложаны ў ёй асноўныя філасофскія пытанні марксізма-ленінізма. Усякі раз, калі прыходзіцца распрацоўваць тэму паскладаней, я перачытваю другі падраздзел IV-га раздзела «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», стараючыся пасцігнуць неўлавімую прастату і сілу стыля гэтай кнігі.

Мы, совецкая інтэлігенцыя, кіруючыя работнікі і ўсе працоўныя, не наёмнікі і не дзеляігі. Наша работа, на якім-бы ўчастку мы ні працавалі, насычана глыбокім палітычным зместам. Барацьба за дысцыпліну працы, за павышэнне якасці прадукцыі, за выкананне плана гэта перш за ўсё пытанне аб знішчэнні капіталістычных перажыткаў, аб соцыялістычных адносінах да працы, аб яшчэ большым брацкім супрацоўніцтве народаў нашага Совецкага Саюза. Мільёны працоўных нашай краіны ў сваёй штодзённай рабоце ствараюць далейшыя раздзелы гісторыі ВКП(б), якія вызначаны ў рашэннях XVIII з'езда Комуністычнай партыі аб паступовым пераходзе ад соцыялізма да вышэйшай фазы—комунізма.

Каб справіцца з гэтымі гістарычнымі задачамі, трэба нам у сваёй рабоце мець непарыўную ўвязку тэорыі з практыкай—тое, што называецца бальшэвіцкім стылем работы. Гэта нам дае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», які з'яўляецца навуковым абагульненнем усяго вопыта гераічнай творчай барацьбы партыі бальшэвікоў і ўсяго рабочага класа за комунізм. Пагэтаму кніга гэта павінна быць настольнай кнігай кожнага свядомага працоўнага, партыйнага і непартыйнага бальшэвіка.


Б. Бургін,
загадчык кафедры замежных моў Беластоцкага педінстытута.



Тав. Хлопскі Я. Д., выкладчык гісторыі ў польскай школе № 1 у Беластоку, закончыў вывучаць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

На здымку: тав. Хлопскі Я. Д. за вывучэннем твора Леніна «Дзяржава і рэволюцыя».

Фота А. Сапіра.



АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 13 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што 12 лістапада дзеянні германскай авіяцыі заключаліся ў налётах невялікай колькасці адзінкавых самалётаў. Непрыяцель скінуў бомбы ў радзе пунктаў, у тым ліку і ў раёне Лондана. Матэрыяльны ўрон і колькасць афяр нязначны. Адзін германскі самалёт збіт каля паўночна-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі.

11 лістапада ўдзень англійская авіяцыя зрабіла налёт на акупіраваную Германіяй тэрыторыю. Усе англійскія самалёты вярнуліся на свае базы. 12 лістапада ніякіх аперацый англійская авіяцыя не рабіла.

Паведамляецца таксама аб тым, што ў ноч на 5 лістапада ваенны карабль праціўніка напаў на караван англійскіх суднаў, які састаяў з 38 параходаў. Англійскі дапаможны крэйсер «Джэрвіс Бой» уступіў у бой з германскім караблём. 9 англійскіх параходаў прапалі без вестакі. Крэйсер «Джэрвіс Бей» у выніку адбыўшагася ўзрыву затануў. Усе астатнія англійскія параходы прыбылі ў порт.

—o—

ЗВОДКА ГЕРМАНСКАГА КАМАНДАВАННЯ

БЕРЛІН, 13 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае наступнае паведамленне вярхоўнага камандавання германскай арміі: «У той час, як англійская авіяцыя ў ноч на 12 лістапада была паралізавана бурай, германскія злучэнні бамбардыроўшчыкаў працягвалі свае паспяховыя налёты на Лондан.

У ноч на 13 лістапада некалькі англійскіх самалётаў скінулі бомбы ў Заходняй Германіі. Прычынен нязначны ўрон. Некалькі чалавек ранена. Германская авіяцыя на працягу ўчарашняга дня страт не мела. Дадаткова паведамляецца, што лік англійскіх самалётаў, збітых на працягу 11 лістапада італьянскім авіяцыйным корпусам, павялічыўся да 10.

Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што адзін германскі бамбардыроўшчык знішчыў чыгуначны віядукт у Горстэме (Паўднёва-Ўсходняя Англія). Такім чынам знішчана важная чыгуначная лінія Горсгэм—Чычэстэр.

Злучэнне германскіх бамбардыроўшчыкаў падвергла паспяховай бамбардыроўцы Брайтон. Поўнасцю знішчана электрастанцыя. Нанесен выключна вялікі ўрон гораду і размешчаным тут ваенным прадпрыемствам.

—o—

ПЕРАГАВОРЫ ГЕРЫНГА З ЛАВАЛЕМ

БЕРЛІН, 12 лістапада. (ТАСС). Поўафіцыёзны бюлетэнь «Дынст аўс Дэйчланд» паведамляе, што ў рамках германа-французскага кантакта і сустрэчы Гітлера з Петэнам адбыліся перагаворы паміж Герынгам і віцэ-прэм'ерам Францыі Лавалем. У перагаворах удзельнічалі таксама паслы абодвух бакоў і генералы фон Бодэншац і Ханесе. Тэма перагавораў, указвае бюлетэнь, невядомая. Тым не менш можна канстатыраваць, што германа-французскі кантакт разгортваецца спрыяюча.

Наступленне італьянскіх войск на грэчаскім фронце

БІТОЛЬ, 12 лістапада. (ТАСС). Пасля некалькіх дзён зацішша на фронце, якое выклікалася дрэнным надвор'ем, у раёне Біглiста-Крысталопіта ўчора ўвечары пачалося наступленне італьянскіх войск на грэчаскія пазіцыі. На працягу ўчарашняга вечара і ночы грэкі былі адцеснены.

Сёння ўстанавілася сонечнае надвор'е. З самай раніцы пачаліся дзеянні авіяцыі. Італьянская авіяцыя бамбардыравала грэчаскі тыл. Англійскія самалёты бамбардыравалі тыл італьянскіх войск. Паводле атрыманых даных, наступленне італьянцаў праходзіць паспяхова. Альпійская дывізія, якая дзейнічае зараз супроць грэкаў, высадзілася ў порце Санты-Кваранта.

БЕЛГРАД, 12 лістапада. (ТАСС). Карэспандэнт газеты «Палітыка» паведамляе з Брапчына (на югаслаўска-албана-грэчаскай граніцы):

«Пасля зацішша, якое працягвалася тры дні, сёння зноў на многіх пагранічных участках была чутна моцная гарматная стральба. Першыя выстралы па грэчаскіх пазіцыях на гарах Марова і Біглы, дзе грэкі на працягу 3-х дзён добра ўмацаваліся, італьянцы зрабілі каля 10 гадзін раніцы. Грэкі прынялі бой. Артылерыйская кананада была чутна ў аддалёных ад граніцы месцах і югаслаўскіх сяленнях.

Пасля 2 гадзін артылерыйскай стральбы італьянцы перайшлі ў наступленне. Іх альпійскія войскі спрабавалі прарвацца ў напрамку да Біглы, Крысталопіті і да возера Малая Прэспа. Націск італьянцаў быў вельмі моцны. Паводле атрыманых тут звестак, яны прымусілі грэкаў адступіць з некаторых асоба важных у стратэгічных адносінах пазіцый. Грэкі люта супраціўляліся і затрымаліся на другой лініі ўмацаванняў.

Такое-ж наступленне прадпрынялі італьянцы і ў раёне гары Марова, дзе ім таксама ўдалося прымусіць грэкаў адступіць з перадавых пазіцый. Грэчаскія атрады, выбітыя з гары Марова, затрымаліся на паўднёвых схілах гары Біглы. На гары Грамос, дзе італьянцы маюць добрыя пазіцыі, не было ніякіх ваенных дзеянняў. У поўдзень на ўсім фронце наступіла зацішша. Але ў 14 гадзін 30 мінут зноў пачалася артылерыйская стральба. Італьянскія самалёты бамбардыравалі схілы гары Біглы і раён возера Прэспа, дзе італьянцы імкнуцца прабіцца паміж Вялікім і Малым азёрамі Прэспа. Грэчаскія зенітныя батарэі адстрэльваліся».

НЬЮ-ЙОРК, 12 лістапада. (ТАСС). Паводле паведамлення карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс з Охрыд (Югаславія), у раёне ракі Каламас у кірунку Піраміцця грэчаскія войскі адбілі італьянскае наступленне.

НЬЮ-ЙОРК, 12 лістапада. (ТАСС). Як перадае будапешцкі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд-Прэс, грэчаскае радыё паведаміла, што грэчаскія войскі працягваюць праследваць італьянцаў у раёне гор. Пінд, захапіўшы ў палон многа салдат і афіцэраў. Захоплена вялікая колькасць ваенных матэрыялаў. У раёне ракі Каламас італьянцы вымушаны былі адступіць.

Англійскія самалёты абстралялі і падпалілі нафтасховішча ў Валоне, разбурана дамба. У порце Санты-Кавараета пашкоджан італьянскі ваенны карабель. Англійскія самалёты бамбардыравалі верфі ў Каніспалісе.



БЕРЛІН, 12 лістапада (ТАСС). Рымскі карэспандэнт агенцтва Трансоцэан перадае, што італьянскія войскі, якія дзейнічаюць у цяперашні час на грэчаскім фронце, разам з накіраванымі туды новымі дывізіямі ўтвараюць так званую «армейскую групу Албаніі», галоўнакамандуючым якой 9 лістапада назначан генерал Содду. Гэта армейская група складаецца з двух армій —9-й і 11-й. Цяперашні камандуючы 3-й арміяй генерал Карло Пелоса назначан камандуючым 11-й арміяй, а генерал Марыо Верчэлі—камандуючым 9-й арміяй.

НЬЮ-ЙОРК, 12 лістапада. (ТАСС). Афінскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе, што за першыя 2 тыдні вайны ў Грэцыі забіта 216 і ранена 818 чалавек. Разбурана 280 будынкаў.

БАМБАРДЫРОЎКА АЛБАНСКАГА ПАРТА ДУРАЦО

ЛОНДАН, 12 лістапада. (ТАСС). Афінскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ў ноч на 12 лістапада англійскія самалёты поўнасцю разбурылі склад гаручага ў албанскім порце Дурацо. Акрамя таго англійская авіяцыя знішчыла склад ваеннага снаражэння ў Валоне (Албанія).

ВЫСТУПЛЕННЕ ГРЫГА

ЛОНДАН, 12 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, 11 лістапада ў Плімуце выступіў з прамовай парламенцкі намеснік англійскага ваеннага міністра Эдвард Грыг. Грыг заявіў:

«Адна з нашых асноўных задач гэтай зімой будзе састаяць у тым, каб нанесці моцны ўдар Італіі на моры, на сухазем'і і ў паветры».

ВЫНІКІ ЗЕМЛЕТРАСЕННЯ Ў РУМЫНІІ

Паведамленне румынскага міністра ўнутраных спраў

БУХАРЭСТ, 12 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе румынскае тэлеграфнае агенцтва, на пасяджэнні румынскага ўрада з паведамленнем аб выніках землетрасення ў Румыніі выступіў міністр унутраных спраў генерал Петравічэску.

Петравічэску заявіў, што найбольш катастрафічныя вынікі землетрасення, якое адбылося ў ноч з 9 на 10 лістапада, адзначаны ў Бухарэсце, у даліне ракі Прахова, Галацы і Факшанах. З меншай сілай землетрасенне сказалася ў 19 гарадах, у прыватнасці ў Валахі. Астатняя частка краіны ад землетрасення амаль не пацярпела. Да вечара 10 лістапада было зарэгістрыравана 267 забітых і 476 раненых. У пацярпеўшыя раёны неадкладна была паслана медыцынская і тэхнічная дапамога, а таксама прадукты харчавання і будаўнічыя матэрыялы.

Петравічэску адзначыў, што да цяперашняга часу з-пад абломкаў аднаго дома выцягнута 54 трупы і 82 раненых. У Бухарэсце эвакуіравана насельніцтва з 183 дамоў, якія пагражаюць абвалам. Акрамя таго пацярпела яшчэ 402 дамы. У Бухарэсце закрыты ўсе глядзельныя прадпрыемствы.

БУХАРЭСТ, 12 лістапада. (ТАСС). Усе газеты вышлі ў зменшаным размеры. Большасць газет запоўнена апісаннем падрабязнасцей землетрасення ў Бухарэсце і іншых гарадах Румыніі. Паводле даных газет, самаму моцнаму разбурэнню падвергся горад Плаешці. У даліне ракі Прахова і ў Плаешці няма ні аднаго цэлага будынка. Многія сёлы ў даліне ракі Прахова разбураны ўшчэнт. У Брашове, Фокшанах, Бырладзе землетрасенне выклікала велізарныя разбурэнні. Ёсць вялікая колькасць чалавечых афяр. Горад Перчыў у павеце Путна зусім разбуран. Значныя пашкоджанні выкліканы землетрасеннем у Ясах. Будынак медыцынскага факультэта стаў непрыгодным для заняткаў.

Нармальны ход жыцця ў Бухарэсце нарушан. Школы не працуюць. Трамвайныя лініі працуюць не ўсе.

Учора ноччу і сёння раніцой у Бухарэсце зноў адчуваліся падземныя штуршкі, але меншай сілы і працягласці.

НЬЮ-ЙОРК, 12 лістапада. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Бухарэста, у выніку землетрасення сур'ёзна пашкоджаны нафтаперагонныя заводы. Паводле маючыхся звестак, некаторыя нафтаперагонныя заводы прымушаны закрыцца на рамонт, які будзе працягвацца звыш 2-х тыдняў.

Пашкоджаны таксама некаторыя рэзервуары з бензінам, аднак бензін удалося выратаваць.

—o—

КОЛЬКАСЦЬ БЕСПРАЦОЎНЫХ У АНГЛІІ

ЛОНДАН, 12 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне англійскага міністэрства працы і нацыянальнай павіннасці, у якім гаворыцца, што на 14 кастрычніка ў Англіі было зарэгістрыравана 333.936 беспрацоўных мужчын і 301.945 жанчын.



Драмгурток беластоцкага шклозавода ў час рэпетыцыі п'есы «Васа Жэлезнова» М. Горкага. Фота А. Сапіра.

КІНО

„Музыкальная гісторыя“

Пеця Гаваркоў працаваў шоферам у таксаматорным парку. Але другая выдатная здольнасць яго была — спяванне. Усе, каму даводзілася чуць яго песню, — а ён спяваў часта — дома, у гаражы, на гулянні, — адразу-ж зачароўваліся яго голасам, моцным і мяккім тэнарам.

Ён любіў музыку, любіў выражэнне чалавечых вялікіх пачуццяў праз шчырую і натхнёную песню. І вось ён на галёрцы Вялікага тэатра, слухае оперу Бізэ — «Кармен». А поплеч з ім сядзеў стары, ды не сядзеў, а гатоў быў скочыць на сцэну, дырыжыраваў і крычаў, захапляўся і абураўся. Здарылася, што абодва гледачы — стары і малады — разам паехалі дадому: першы — ехаў, другі... вёз, — ён быў простым шоферам таксі. І ў абодвух размова аб партыі Хозэ з оперы «Кармен». Стары аказаўся былым артыстам оперы, ён абураўся, што саліст спяваў фальшыва, а шофер не разбіраўся ў тэрміне лябемоль, і тут-жа, у машыне праспяваў арыю так, як лічыў найлепшым.

Гэта і было пачаткам, з якога пайшло ўсё па-новаму. Стары артыст Васілій Фаміч Македонскі быў у захапленні ад такой знаходкі, ён паставіў сабе задачай падрыхтаваць з юнака сапраўднага саліста.

Пеця не толькі музыку, ці песню, любіў. Ён, савецкі юнак, любіў добрай любоўю сваю працу. Ён, малады чалавек, пакахаў дзяўчыну—дыспетчара таксапарка Клаву Белкіну. Ды пакахаў так, як любіць жыццё жыццерадасны, як кахае сэрца чыстае і вялікае.

Праўда фільма ў тым, што адароны чалавек у нашай краіне заўсёды знойдзе месца свайму таленту, калі ён толькі чэсна аддае сябе той справе, да якой мае найбольшую здольнасць. Просты шофер Гаваркоў стаў, як і прадказваў Македонскі, артыстам оперы. Але Македонскі не проста сказаў гэта, ён вопытным чуццём знайшоў сапраўднае дараванне, а благародства савецкага мастака вяло яго на нястомную працу над тым, каб цярпліва выхаваць таленавітага юнака. І артыст Н. Канавалаў, які іграе надзвычайна, з падкупляючай цеплынёй і праўдзівасцю, пранёс вобраз абаяльнага чалавека які ўлюблён да канца ў сваё мастацтва і аддае яму ўсяго сябе.

Харaство і прыемная лёгкасць фільма ў тым, што ён пабудован цалкам на класічных музыкальных творах Чайкоўскага, Рымскага-Корсакава, Бізэ, Барадзіна. То велічава-урачыстая, то нежна-лірычная, а часам журботна-інтымная, льецца музыка ва ўсіх кадрах.

Усе кадры фільма пабудаваны на музыцы. Здаецца без гэтай музыкі яны не давалі-б такой поўнай абрысоўкі драматызма. Але і музыкальныя моманты, калі іх слухаць без суправаджэння такімі рэальнымі дзеяннямі, як у гэтым фільме, таксама не даюць поўнага адчування глыбокай выразнасці музыкі. Музыка арганічна ўпрыгожвае дзеянне.

У фільме частыя вострыя сцэны, нямала смешнага. Так артыст Э. Гарын проста і забаўна падаў вобраз нікчэмнага і пошлага Альфрэда Тараканава. Так і ва ўсіх камедыйных момантах, як, напрыклад, эпізод паездкі з тэатра.

Аўтары фільма (сцэнарыст Е. Петроў і Г. Мунбліт, рэжысёры А. Іваноўскі і Г. Рапапорт) знайшлі здаровае пачуццё меры ва ўсім, дасягнулі найбольшай узаемасыгранасці дзеянняў. Трэба толькі адзначыць, што такая майстрыца кінасцэны, як артыстка Зоя Фёдарава, не натружана дзеяннем. Фёдарава тут не магла выявіць сваю багатую рознабаковасць. Аднак ролю Клавы, шчырай дзяўчыны, вернай свайму пачуццю, Фёдарава сыграла надзвычайна праўдзіва і цікава.

Што-ж датычыць галоўнай ролі Пеці Гаваркова, якую выконвае артыст С. Лемешаў, то яна пакідае ў гледача ўражанне незабыўнага харaства і прыемнасці. Вобраз простага шофера, якога пасля выканання партыі Ленскага на клубнай сцэне таварышы накіроўваюць вучыцца ў кансерваторыю, дзе ён вырас у выдатнага саліста оперы, сыгран даволі ўдала, калі прыняць пад увагу, што выканаўца Лемешаў з'яўляецца не драматычным акторам, а артыстам оперы. І ў тых кадрах, дзе паказана яго выступленне на сцэне Вялікага тэатра, калі яму нястрымна апладыруюць і глядзельны зал і ўсе акторы, артыст дасягнуў асаблівага зачаравання.

Уся каштоўнасць фільма ў пераканаўчай сіле, з'явы тут асмыслены з усіх бакоў, яны даюць высокае маральна-грамадскае ўздзеянне, павучаюць і захапляюць. На шляху да стварэння першакласных савецкіх лірычных камедый гэта вясёлая «Музыкальная гісторыя» будзе займаць віднейшае месца.

І. Клінаў.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—95. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдрук.